Прачытай сам і перадай другому.

№ 32 (4592)

30 красавіка 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
Якуб КОЛАС

НУ И НУ!

Юрий ВОСКРЕСЕНСКИЙ: «Нужно менять полностью весь состав парламента»

Законопроект об амнистии, который подготовлен представителями информационно-аналитического учреждения «Круглый стол демократических сил», был направлен в Палату представителей. «Народная воля» поинтересовалась реакцией депутатов.

Как уже сообщалось, в законопроекте предлагается амнистировать политзаключенных – к проекту прилагается список из 425 имен людей, которые сейчас находятся за решеткой. Среди них – отец и сын **Виктор и Эдуард Бабарико**, гражданская активистка **Мария Колесникова**, художник **Алесь Пушкин** и многие другие.

Мы обзвонили некоторых депутатов, в том числе и представителей комиссии по национальной безопасности, все ответили однозначно: законопроекта об амнистии в глаза не видели.



– Безусловно, мы направили этот законопроект всем 110 депутатам Палаты представителей, – *рассказал «Народной Воле» руководитель информационно-аналитического учреждения «Круглый стол демократических сил»* ***Юрий Воскресенский***. – Но ответил только один депутат.

Депутаты у нас безынициативны, поэтому, возможно, нужно менять полностью весь состав парламента. Они и не поддержали, и не отклонили наш законопроект.

– А назовите имя депутата, который прислал ответ.

– Уткин. Как его зовут – не знаю, он указал только свои инициалы и прислал очень короткое сообщение: «*С информацией ознакомлен. Данная информация будет рассматриваться в установленном порядке*».

– И что вы дальше намерены делать?

– Дальше будем продвигать законопроект и убеждать в необходимости его принятия.

– А кого убеждать?

– Будем встречаться с теми же депутатами – и Палаты представителей, и Совета Республики, снова им писать.

Мы направили законопроект во все заинтересованные государственные структуры: в Национальный центр законодательства и правовых исследований, в Совмин, в Оперативно-аналитический центр, Совет Республики.

– Из комиссии по национальной безопасности, которая, по идее, первой должна рассмотреть данный законопроект, тоже ответа не было?

– Нет. Ответил только Уткин.

– А на Лукашенко с этим законопроектом выходили?

– Нет, потому что сначала мы должны пройти сито нижестоящих структур, тот же парламент. И если Палата представителей одобрит, то проект попадет ему в руки.

– Зато он может дать волшебный пендель депутатам.

– Я писал на имя Лукашенко ходатайство об освобождении Тихановского и обоих Бабарико еще в октябре минувшего года, но ответа не получил. Это было в октябре, тогда и ситуация была немного другой.

Амнистия у нас происходит только в связи с принятием закона, поэтому мы и начали работу с Палаты представителей. Общество ждет этот законопроект. У нас на сайте была голосовалка, мы спрашивали: «*Поддерживаете ли вы инициативу Круглого стола демократических сил о политической амнистии для всех политзаключенных?*». Всего проголосовало 64.964 человека, из них 53.762 поддержали нашу инициативу (это 83 процента). А депутаты просто промолчали. Никто из них не сказал: «я осуждаю этот законопроект», «считаю нецелесообразным амнистировать» или «давайте обсуждать». Но решили просто отмолчаться...

Честно говоря, мы думали, что политическая ситуация немного остынет, мы проведем серию встреч с теми же депутатами. А ситуация только накаляется... Но мы будем добиваться принятия этого законопроекта.

– Депутаты, с которыми я разговаривала, утверждают, что вашего законопроекта в глаза не видели. И специальной рабочей группы в парламенте по данному законопроекту не создано.

– Мы всем отправили по электронной почте – каждому на личный ящик, указанный на сайте Палаты представителей. Я могу даже скрин исходящего письма прислать – там всё видно: кому и куда был отправлен законопроект.

– Может, еще не все депутаты освоили электронную почту?

– Не исключено. В понедельник каждому депутату тогда еще раз отправим уже печатный вариант. Нам не хотелось бы оставить этот вопрос без ответа.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ...

А что с Избирательным кодексом?

Идет ли в Палате представителей работа над новым Избирательным кодексом или изменениями в действующий?

Судя по всему, нет. И это несмотря на то, что до очередных выборов остаются считанные месяцы!

«Народная Воля» поговорила с некоторыми депутатами, и все как один сказали: нет, не слышали, не в курсе, пока ничего нет.

«*Идет работа над Уголовным кодексом и над другими законопроектами, которые были приняты в первом чтении. Избирательного кодекса в работе нет*», – сказал «Народной Воле» зампредседателя комиссии по национальной безопасности, экс-заместитель генерального прокурора **Александр Дубов**.

«*Может, работа над Избирательным кодексом где-то и идет, но на каком этапе и где – не знаю, поэтому не готов комментировать, у нас в комиссии по международным делам своих вопросов хватает*», – заявил «Народной Воле» депутат **Тенгиз Думбадзе**.

Пока ясно одно: депутаты не в курсе, будет ли меняться избирательное законодательство и если да, то когда. Это почти как с законопроектом о бюджете, который депутаты умудряются якобы глубоко проработать буквально за пару суток. А на самом деле – что дали, за то и проголосовали, всеобщий «одобрямс». Вероятно, так будет и с Избирательным кодексом. Если, конечно, его вообще будут менять.

Марина КОКТЫШ.

ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

Вы – з «Народнай Воляй», «Народная Воля» – з Вамі!

Шаноўныя чытачы!

Паважаныя валанцёры!

Як вы ведаеце, мы разлічвалі, што ўжо 2 красавіка адновім выпуск газеты «Народная Воля» ў папяровым варыянце. На жаль, літаральна ў апошні момант маскоўская друкарня скасавала дамову, паведаміўшы, што на іх «*сильно наехали*».

Што ж, не будзем апускаць рукі. Давайце з аптымізмам глядзець у заўтрашні дзень. «Адрамантуюць» жа некалі станок у выдавецтве «Беларускі Дом друку», і аднавяцца нармальныя стасункі з тутэйшымі паліграфістамі. А пакуль, сябры, працягвайце чытаць «Народную Волю» ў электронным варыянце. Падпісацца на PDF-версію газеты можна на сайце ***belpressa.by***.

Паколькі мы цяпер не маем даходаў ад рэалізацыі выдання праз «Белпошту» і «Белсаюздрук», то ў чарговы раз звяртаемся да Вас, дарагія прыхільнікі свабоднага слова, з просьбай: **дапамажыце!**

Толькі разам мы зможам уратаваць «Народную Волю». Ёсць некалькі спосабаў пералічыць грашовыя сродкі (даём рэквізіты ў рускай транскрыпцыі):

1. Через ЕРИП:
СМИ – Н (просто буква) – «Народная Воля» – Добровольные взносы.
2.Через БАНК:
ИЧУП «Народная Воля». 220030, г.Минск, ул.Энгельса 34а
р/с BY08 PJCB 3012 0065 3510 0000 0933,
Код PJCBBY2X, ЦБУ 113 «Приорбанк» ОАО, г.Минск
УНП 100961759, ОКПО 37381505

Загадзя выказваем шчырую ўдзячнасць!

Вы – з «Народнай Воляй», «Народная Воля» – з Вамі!

АНОНС

Сяргей КАЛЯКІН, старшыня Беларускай партыі левых «Справядлівы свет»:



– Дыялог, перамовы – гэта патрабаванне ўсіх разумных людзей у Беларусі і за яе межамі. А тыя, хто прапануе вырашэнне праблемы сілавым метадам, вядуць краіну ў прорву. Яны вядуць краіну да будучых узрушэнняў, распальваюць варожасць сярод людзей, якія прытрымліваюцца розных поглядаў.

(Інтэрв'ю з лідарам Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» – на 2-й стар.)

ДЕМОКРАТИЯ ПО-БЕЛОРУССКИ

Отбюрократились...

Мингорисполком отказал Белорусскому конгрессу демократических профсоюзов в проведении в парке Дружбы народов митинга 1 Мая – в Международный день солидарности трудящихся.

– На двух страницах чиновники старательно перечислили причины отказа, – *рассказал председатель БКДП* ***Александр Ярошук***. – Здесь и отсутствие договоров с обслуживающими организациями (а мы их и не собирались заключать, не за что отдавать немалые деньги налогоплательщиков), и пандемия, и даже то, что, оказывается, мы несвоевременно подали заявку на митинг.


Хотя заявку мы подали своевременно – 16 апреля, ровно за 15 дней до мероприятия, а Мингорисполком нас известил, что получил ее только 19 апреля. Вероятно, в нашей стране электронная почта из офиса БКДП в Мингорисполком не доставляет письма моментально, а ползет черепашьим шагом.

Впрочем, реальность нынче такова, что чиновники вполне могли открытым текстом написать: скажи спасибо, что только отказали, а не посадили на 15 суток. Как посадили недавно Игоря Борисова и Дмитрия Кучука, лидеров БСДП и Партии «зеленых», за намерение отметить День Воли 25 марта и провести «Чарнобыльскі Шлях» 26 апреля.

Галина РУТ.

ПАМЯЦЬ

Зорны час Міколы Ермаловіча



Памятаю, як у сярэдзіне 1970-х з рук у рукі хадзіў па Мінску размножаны на капіравальным апараце машынапісны тэкст пад назвай «Сто старонак». Тэкст быў без подпісу, але чытачы ведалі: яго аўтар Мікола Ермаловіч. Гэта была сур'ёзная гістарычная праца, у якой насуперак тагачаснаму афіцыёзу сцвярджалася, што мы, беларусы, – самастойная еўрапейская нацыя, што ніякія літоўцы ніколі нас не заваёўвалі, а Вялікае Княства Літоўскае – наша старажытная дзяржава.

З надыходам галоснасці тыя «100 старонак» былі выдадзены асобнай кнігай – як «Гісторыя аднаго міфа», прычым масавым накладам. Следам прыйшла да чытача і Ермаловічава «Старажытная Беларусь», за якую аўтар атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Кастуся Каліноўскага (такіх лаўрэатаў усяго трое; прэмія пасля прыходу да ўлады А.Лукашэнкі была скасавана).

А пазнаёміліся мы з Міколам Іванавічам у 1988 годзе ў майстэрні мастака Аляксея Марачкіна. Запомніўся ён мне тактоўна ўважлівым у размове, у ім не было ні кроплі самаўпэўненасці. Перакінуліся коратка ўражаннямі ад тагачасначе перабудовы, што разнявольвала грамадскую думку, руйнуючы застарэлыя міфы, рэабілітуючы многія імёны. Праз год праз Беларускі фонд культуры мы запрасілі Ермаловіча выступіць з лекцыяй «Полацк – калыска беларускай дзяржаўнасці» перад беларусамі ў Маскве. Ён прыехаў і прачытаў тую лекцыю проста бліскуча.

Прыгадваецца яшчэ адна мінская сустрэча вясной 1991 года. Гудзе пчаліным роем Дом літаратара – пачынаецца ўстаноўчы з'езд Міжнароднага аб'яднання беларусістаў. Ад гардэроба ў фае – даўжэзная чарга, кожны трымае ў руках набыты тут жа том «Старажытнай Беларусі». За сталом – знаёмая постаць у акулярах з тоўстымі шкельцамі, з навіслай над чалом густой пасмачкай валасоў... «Зорны час Ермаловіча!» – падумалася тады мне. Гэткую ж кнігу даслаў ён мне крыху раней – з кранальным надпісам: «Дарагому Аляксею Каўку з падзякай за яго плённую патрыятычную дзейнасць».

Пазней і я паслаў Ермаловічу сваю кнігу. І неўзабаве атрымаў ліст-адказ: «*Дарагі Аляксей Канстанцінавіч! Найперш вялікі дзякуй Вам за выдатны навагодні падарунак усім нам, хто ахоплены духам барацьбы за жыццё нашай Бацькаўшчыны. Я маю на ўвазе Вашу цудоўную кнігу з назвай, якая гучыць клічам, – «Будам жыць!». Добрага Вам здароўя і далейшых новых поспехаў у Новым годзе! З найглыбейшай павагай М.Ермаловіч. 31.XII.1998*».

Яшчэ адзін памятны абразок – з Першага з'езда згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». Тысячная грамада сабралася ў Оперным тэатры. Старшыня са сцэны запрашае ў прэзідыум Міколу Ермаловіча. Зала ўзрываецца воплескамі. І наш герой неяк нерашуча, нібы саромеючыся тых воплескаў, ідзе на сцэну, сядае поруч з Васілём Быкавым і Станіславам Шушкевічам...

Неяк у Ленінскай (будучай Нацыянальнай) бібліятэцы Мікола Іванавіч даверыў мне свае машынапісныя «Гутаркі» (самвыдавецкі часопіс, патаемна распаўсюджваўся ў 1970-я). Пачытаўшы іх, я адкрыў для сябе Ермаловіча-паэта. Двума вершамі з тых легендарных ужо «Гутарак» хачу падзяліцца і з чытачамі «Народнай Волі» – на 100-я ўгодкі выдатнага гісторыка-патрыёта. Са спадзяваннем, што зорны час Ермаловіча, зорны час Беларусі – не за гарамі.

Аляксей КАЎКА, доктар філалагічных навук.
Масква.

Мікола ЕРМАЛОВІЧ

Чужое і сваё

Чужыя кветкі на нашым полі,
Чужыя зоркі у нашым небе.
Чужыя кветкі на душы труцяць,
Чужыя зоркі нас з тропаў зводзяць.
Чужыя кветкі хутчэй мы вырвем,
Чужыя зоркі смялей мы згасім.
Свае засеем мы кветкі ў полі,
Свае запалім мы зоркі ў небе.
Свае нам кветкі душу ўваскросяць,
Свае нам зоркі шляхі пакажуць.

Ля замчышчаў даўніх

Невясёлыя думкі маркоцяць мяне,
Калі бачу я замчышчаў даўніх вышыні.
Там кавалася слава маёй старане,
Там калісьці былі нашай волі цвярдыні.
Ды ў віхурах вякоў не ўтрымаліся там
І спаўзлі мы наніз, у бясслаўе упаўшы.
Як далёка нам, сённяшнім ціхім рабам,
Да грымотных вышыняў
мінуўшчыны нашай!

Народная Воля
http://www.nv-online.info
30 КРАСАВІКА 2021 г.

ПАЛІТКУХНЯ

Сяргей КАЛЯКІН: «Страусіная пазіцыя некаторых лаяльных партый разбурыла агульную дамоўленасць»

10 верасня мінулага года кіраўнікі дзесяці палітычных партый паставілі свае подпісы пад рэзалюцыяй, у якой запатрабавалі спыніць гвалт і ў бліжэйшы час правесці новыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Вось фрагмент дакумента:

«Мы, прадстаўнікі палітычных партый, абмеркавалі грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне і зараз патрабуем ад дзяржаўных органаў і службовых асоб прыняць усе неабходныя меры па спыненні гвалту ў дачыненні да грамадзян, якія рэалізуюць сваё канстытуцыйнае права на мірныя пратэсты, тэрмінова вызваліць усіх затрыманых, распачаць крымінальныя справы па фактах забойстваў, катаванняў, збіцця, адвольных затрыманняў для будучага прыцягнення да адказнасці вінаватых.

Таксама прапануем органам дзяржаўнай улады арганізаваць дыялог з прадстаўнікамі ўсяго спектра грамадска-палітычных сіл Беларусі па пытанні правядзення на працягу 6 месяцаў новых выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Пад рэзалюцыяй паставілі подпісы прадстаўнікі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) (**Ігар Барысаў**), Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» (**Сяргей Калякін**), Рэспубліканскай партыі працы і згоды (**Эдуард Нарышкін**), Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі (**Уладзімір Александровіч**), Рэспубліканскай партыі (**Дзмітрый Кармазін**), Аб'яднанай грамадзянская партыі (**Мікалай Казлоў**), Партыі БНФ (**Рыгор Кастусёў**), Беларускай партыі «Зялёныя» (**Леанід Кучук**), партыі «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада» (**Мікалай Лысянкоў**), Сацыял-дэмакратычнай партыі Народнай згоды (**Сяргей Ярмак**).

Праз нейкі час некаторыя партыі адхрысціліся ад сваёй датычнасці да рэзалюцыі. Напрыклад, Рэспубліканская партыя зрабіла заяву, што Дзмітрый Кармазін да іх арганізацыі не мае ніякага дачынення, бо быў выведзены з арганізацыі за некалькі месяцаў да таго, як паставіў подпіс ад імя партыі.

У снежні змянілася кіраўніцтва і ў Рэспубліканскай партыі працы і згоды, бо *«з'явіліся сур'ёзныя рэчы, якія кампраметуюць партыю, зроблена спроба змяніць палітычную лінію ў бок апазіцыі»*.

Дарэчы, у рэзалюцыі быў і такі пункт: *«заснаваць сход палітычных партый Рэспублікі Беларусь на пастаянна дзеючай аснове»*.

Мы вырашылі высветліць у аднаго з ініцыятараў таго сходу – лідара Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» **Сяргея КАЛЯКІНА**, чым закончылася іх восеньская ініцыятыва.

– Пасля таго як з'явілася рэзалюцыя, адбыўся «наезд» на партыі, а ў адной з іх нават меў месца рэйдарскі захоп арганізацыі, – кажа Сяргей Іванавіч. – У такіх умовах сход практычна немагчыма было збіраць у тым складзе, у якім планавалі. Больш-менш лаяльным да ўлад партыям, відаць, патлумачылі іх магчымы будучы лёс і тое, што яны павінны рабіць на гэты момант.

– Ніводнага сходу так і не адбылося?

– Пару раз збіраліся, але паступова перасталі прыходзіць прадстаўнікі лаяльных партый. І тады знікла неабходнасць у такіх сходах, бо апазіцыйныя партыі і так могуць сабрацца і нешта абмеркаваць.

Адным словам, трэба шчыра прызнацца: ініцыятыва аказалася нежыццяздольнай, бо многія, што называецца, занялі страусіную позу. У верасні яны былі абураны тым, што адбываецца ў краіне, вырашылі выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю, а далей улады на гэтыя партыі, напэўна, націснулі, і тыя ахаладзелі да ідэі, пад якой раней падпісаліся.

– У рэзалюцыі вы прапаноўвалі органам дзяржаўнай улады *«арганізаваць дыялог з прадстаўнікамі ўсяго спектра грамадска-палітычных сіл Беларусі па пытані правядзення на працягу 6 месяцаў новых выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь»*. Верылі, што гэта магчыма?

– Не верылі, а прапаноўвалі органам улады цывілізаваны выхад з той сітуацыі, якая склалася. І ў той жа час разумелі, што без жадання іншага боку ажыццявіць нашы прапановы немагчыма.

Асабіста мне падаецца, што дыялог – найлепшы выхад з любой крызіснай сітуацыі. І гэты дыялог з грамадствам улада павінна весці штодзень. Для гэтага ёсць інструменты – палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, у рэшце рэшт, парламент, дзе павінны прысутнічаць сапраўды абраныя народам прадстаўнікі.

Мы прапанавалі ўладам стварыць дыялогавую пляцоўку, але гэта нікога не зацікавіла. Хаця наша прапанова застаецца ў сіле, нягледзячы на тое, што шасцімесячны тэрмін, які пазначаны ў рэзалюцыі, ужо прайшоў. Заўважу: тая дыялогавая пляцоўка, якую прадстаўляе Васкрасенскі, – гэта не што іншае як фікцыя.

Дыялог, перамовы – гэта патрабаванне ўсіх разумных людзей у Беларусі і за яе межамі. А тыя, хто прапануе вырашэнне праблемы сілавым метадам, вядуць краіну ў прорву. Яны вядуць краіну да будучых узрушэнняў, распальваюць варожасць сярод людзей, якія прытрымліваюцца розных поглядаў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПАЗІЦЫЯ

«Важней за ўсё – жыць з чыстым сумленнем»

Гродзенская актывістка Любоў Сарлай лічыць, што яе несправядліва звольнілі з працы. Яна не падае духам, шукае новае месца работы, дзе найбольш будзе карыснай людзям, і ўпэўнена, што ўсё ў нашым жыцці хутка зменіцца.

Толькі не 25 сакавіка...

32-гадовая Любоў Сарлай стала вядомай не толькі гродзенцам, але і многім жыхарам Беларусі пасля таго, як яе асудзілі за прагулку па цэнтры горада ў штанах з бел-чырвона-белымі лампасамі. Хаця насамрэч Любоў неаднойчы затрымлівалі і падчас акцый пратэсту ў Гродне.

Жанчына працавала аператарам у адным з гарадскіх аддзяленняў «Белпошты». Гісторыя са звальненнем пачалася з таго, што яна напісала заяву, каб 25 сакавіка ёй далі выхадны дзень. Начальства з гэтым не пагадзілася.

– *Мне сказалі: можаш браць потым хоць некалькі выхадных, але толькі не 25-га*, – згадвае Любоў.

Тым не менш жанчына на працу 25 сакавіка не выйшла, за яе працаваў іншы чалавек. У гэты дзень да спадарыні Сарлай дадому прыйшлі міліцыянеры і адвезлі яе ў пастарунак. Аказваецца, нехта ў той дзень паклаў на гары перад замкам вялікі бел-чырвона-белы сцяг. Высвятлялі, ці не мае Любоў да гэтага дачынення.

На працы ніякіх спагнанняў за прапушчаны дзень не было.

– *Дырэктар ведае, што я работнік абавязковы і адказны*, – мяркуе жанчына. – *Мне ніякіх заўваг не было ні ад начальства, ні ад людзей, якіх я абслугоўвала. Ды і працоўны стаж у мяне адлічваецца з 2008 года.*

Аднак калі Любоў звярнулася да начальства з просьбай перавесці яе ў іншае аддзяленне сувязі, каб было зручней адвозіць дзетак у садок, рэакцыі не паследавала. А ў красавіку яна атрымала заробак меншы, чым месяцам раней.

– *У мяне за месяц атрымалася зарплата 380 рублёў*, – канстатуе жанчына. – *А я на працы з раніцы і дахаты вярталася а 20-й гадзіне, а яшчэ трэба адвозіць у садок дзяцей. Ну гэта нерэальна за такія грошы працаваць, бо няма за што жыць!*

Любоў, параіўшыся з мужам, напісала заяву на звальненне. І тады дырэктар сказаў, што яе звольняць па артыкуле за прагул 25 сакавіка.

– *Мне, канешне, было крыўдна: столькі гадоў працы – і такое атрымаць!* – прызнаецца жанчына. – *Нават плакала, але муж патлумачыў: наіўна было б чакаць ад начальства чагосьці іншага.*

«Хочацца быць карыснай людзям»

Цяпер, распавядае спадарыня Любоў, яна больш часу аддае дзеткам – у яе два сыны: аднаму хутка сем, другому тры годзікі. І шукае новую працу.

– *Пачала з пошуку нейкіх курсаў, бо трэба мяняць спецыяльнасць. Канечне, пражыць на адзін заробак мужа вельмі складана, але мы абодва разумеем: важней за ўсё – жыць з чыстым сумленнем.*

У Любы пазітыўны погляд на жыццё, нягледзячы на ўсе пертурбацыі, якія адбываюцца ў краіне. Яна добра ведае, што многія цяпер не могуць знайсці нармальную працу пасля ўдзелу ў акцыях і адбыцця пакарання. Паводле слоў жанчыны, жыццё на гэтым не заканчваецца, а рабіць дабро трэба ў любых умовах.

Днямі Сарлай падала скаргу ў Вярхоўны суд на рашэнне абласнога, паколькі не была задаволена яе скарга на прысуд, вынесены Ленінскім судом: пакараць яе за прагулку па цэнтры горада ў штанах з бел-чырвона-белымі лампасамі штрафам у 20 базавых велічынь (580 рублёў). Дарэчы, гэта больш за яе месячны заробак.

Міхал КАРНЕВІЧ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Як праходзіць галадоўка сярэбранага прызёра Алімпіяды Андрэя Краўчанкі?

Спартсмен распавёў «Народнай Волі» падрабязнасці сваёй акцыі салідарнасці.

У мінулую нядзелю Андрэй Краўчанка абвясціў 10-дзённую галадоўку ў знак салідарнасці з палітвязнямі. Акрамя таго, стала вядома, што спартсмен выставіў на аўкцыён свой залаты медаль чэмпіянату Еўропы ў памяшканнях, каб дапамагчы сем'ям палітычных зняволеных.

– Галадоўку я пачаў 25 красавіка ў 20.00, – распавядае Андрэй. – Ад ежы цалкам адмовіўся, толькі п'ю ваду. На сухую галадоўку не адважыўся, бо ў такім выпадку, як кажуць, згублю ўсе мышцы.

– Раіліся з жонкай і блізкімі перад тым, як пайсці на такі крок?

– Ні з кім не раіўся, гэта цалкам маё асабістае рашэнне. Было ўнутранае пасланне, я да яго прыслухаўся. Мне рэальна надакучыла глядзець на тое беззаконне і той абсурд, што творыцца ў краіне. Захацелася хоць нешта зрабіць у падтрымку тых, хто пакутуе ад гэтага беззаконня. Каб людзі разумелі, што яны не засталіся сам-насам са сваім горам, бачылі падтрымку іншых.

Так, безумоўна, здароўю галадоўка на карысць не пойдзе, па фізічнай форме будзе адкат месяцы на тры-чатыры. Але я да гэтага гатовы.

– Як адчуваеце сябе ў першыя дні пасля абвяшчэння галадоўкі?

– Першыя два дні было вельмі дрэнна. Спачатку пачаліся сутаргі, а другую ноч я наогул не спаў. Зябіла, увесь час адчуваў холад.

Але на трэці дзень галадоўкі стала лягчэй, відаць, арганізм аўтаматычна перайшоў на ўнутраныя рэзервы, калі зразумеў, што ежы не будзе.

– З дому ў гэты час нікуды не выходзіце?

– Чаму? Трэніроўкі я не адмяняў. Зразумела, што максімальную нагрузку не даю, бо і так трэба эканоміць сілы для арганізма, але трэніровачны працэс у любым выпадку працягваецца.

Я сабе распісаў комплекс практыкаванняў на ўсе групы мышцаў і прытрымліваюся гэтага комплексу. Кожны дзень раблю пэўную колькасць практыкаванняў, каб форму не губляць.

Але, натуральна, усё будзе залежаць ад самаадчування, бо адмыслова гвалціць арганізм не збіраюся. Тым больш што з кожным днём стан здароўя, відаць, будзе толькі пагаршацца. Ужо зараз часам цямнее ўваччу. Адчуваю, што энергія сыходзіць.

– Жонка не пераконвала, што не варта ісці на такія ахвяры?

– Яна мяне, наадварот, падтрымала і таксама адмовілася ад ежы на пэўны час. Не на дзесяць сутак, натуральна, але я ацаніў яе падтрымку.

Бог узнагародзіў мяне сілай волі, таму, думаю, усе складанасці вытрымаю годна.

Алесь СІВЫ.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Либерализация господина Каллаура под угрозой

Всё началось на фоне политического кризиса после президентских выборов в августе-сентябре прошлого года, когда пошел похожий на эвакуацию массовый исход валютных сбережений населения из банковской системы. Так, в августе вынос всех видов депозитов в валюте составил 624 млн в долларовом эквиваленте, в сентябре – 470 млн долларов. К концу года срочные валютные вклады физических лиц сократились на четверть. Это объяснялось опасением вкладчиков за сохранность своих сбережений в банках. Тем более что в это время рубль рекордно упал к доллару. От общественности не укрылся и тот факт, что Нацбанк только в августе потратил на поддержку падающего рубля свыше 1 млрд долларов. Считай, почти всё, что заняли в виде евробондов в июне (1,25 млрд долларов).

К концу 2020 года ситуация с валютными депозитами вроде успокоилась. Однако с начала текущего года отрицательная динамика убытия валютных депозитов вновь усилилась: за первый квартал срочные валютные депозиты уменьшились на 4,3%, или на 200,7 млн долларов, до 4,439 млн долларов.

Депозиты населения – важнейшая часть банковских ресурсов, из которых кредитуется реальный сектор экономики. Сейчас их доля в пассивах банков во всех валютах немного больше четверти – 26%, год назад было 33%.

С марта 2020-го по март 2021 года падение достигло по рублевым вкладам – 4,628 млрд, по валютным – 1,914 млрд долларов. Причем переток оставшихся срочных валютных вкладов в рублевые почти не происходит, несмотря на более высокую доходность последних. Валюта из депозитов физических лиц уходит в кэш – в наличные доллары и евро, – то есть остается на руках у населения (как шутит народ, в банках стеклянных, в чулках, под матрасом и т.д.). А это значит, что она в функционировании экономики не участвует. Уже много месяцев подряд население остается чистым покупателем валюты. Локальный максимум хранения населением средств в банках на валютных вкладах был зафиксирован в октябре 2015 года – 7,829 млрд долларов. С тех пор остатки на валютных счетах сократились на 3,342 млрд «зеленых».

А тут новый шок! За первый квартал нынешнего года Беларусь потеряла почти 530 млн долларов своих золотовалютных резервов, что было связано в основном с плановым погашением внешних и внутренних обязательств страны (310 млн долларов) и снижением мировых цен на монетарное золото. Пополнение Министерством финансов валютных резервов за счет размещения на внутреннем рынке облигаций на сумму более 600 млн долларов ушло на спасение от банкротства Белорусского металлургического завода. К 1 апреля золотовалютные резервы упали до 6,940 млрд долларов. По расчетам Нацбанка, к концу года золотовалютные резервы страны не должны быть меньше 6 млрд долларов. Грядущие затраты по сроку погашения госдолга будут 3,3 млрд долларов. Если денежные власти совсем не найдут валюты на рефинансирование этих обязательств, то от валютной части резервов ничего не останется. И что тогда? Продавать, как Венесуэла, золото?

Россия обещала к лету выделить обещанный второй транш кредита из своего бюджета в размере 500 млн долларов. Есть и еще один фактор, который пока поддерживает на плаву белорусский рубль. Это положительное сальдо во внешней торговле Беларуси. За 13 последних месяцев благодаря ударному труду шахтеров и нефтяников экспорт товаров и услуг превысил их импорт на 2,68 млрд долларов. Прошедшие в 2020 году две девальвации белорусского рубля играли на руку отечественным экспортерам и ударили соответственно по импортерам, сократив их покупательную способность. Положительный результат внешней торговли дает тактическую поддержку белорусскому рублю. Но если взять стратегический фактор, который действует в более длительном временном горизонте, а это значит своевременно отдавать долги и без кредитной поддержки со стороны западного вектора, то он может принести серьезнейшие проблемы. Особенно в свете санкций, принятых США в отношении предприятий-экспортеров концерна «Белнефтехим».

Таким образом, развитие событий после президентских выборов с прошлогоднего августа явно ведет страну к валютно-финансовому кризису образца не такого далекого 2011 года, когда белорусский рубль за считанные дни девальвировался в 2,6 раза, а инфляция, не сильно отстав, увеличилась к концу года более чем в 2 раза. Памятуя уроки того кризиса, денежные власти принимают упреждающие меры. В Беларуси с 9 июля введут изменения в области валютного регулирования и контроля. Известно о подписанном 20 апреля указе №154, который отменяет действие указа №240 «О некоторых вопросах в области валютного регулирования» от 12.05.2009 и указа №301 «Об отмене обязательной продажи иностранной валюты» от 31.07.2018. Этим по сути вводятся изменения в Закон №226-З «О валютном регулировании и валютном контроле». В документе прописано, что в случае угрозы экономической безопасности страны, стабильности финансовой системы, если ситуация не может быть решена другими мерами экономической политики, власти могут ввести валютные ограничения сроком действия до одного года. К таким угрозам относят: негативное развитие ситуации в платежном балансе, следствием которого может стать снижение золотовалютных резервов Беларуси ниже допустимого уровня; резкие колебания курса белорусского рубля (читай – обвальная девальвация); обстоятельства, при которых осуществление мер по ослаблению или отмене валютных ограничений может повлечь ухудшение экономической и финансовой ситуации в Беларуси либо нанести ущерб интересам безопасности страны и препятствовать поддержанию общественного порядка.

Последняя фраза очень характерна. Какие же валютные ограничения Нацбанк совместно с правительством, загодя подстраховываясь от шоков обмеления валютного рынка, могут ввести? Запрет на проведение валютных и валютно-обменных операций; лимиты на объемы и сроки проведения валютных операций; требования на получение спецразрешения у Нацбанка на валютные операции; обязательную продажу полученной юрлицами-резидентами иностранной валюты; ограничения по открытию и ведению резидентами счетов в иностранных банках. Собственно, всё то, что уже было ранее в разные годы. Следовательно, та либерализация валютного законодательства и валютного рынка, которой шаг за шагом упорно добивался Нацбанк с командой П.Каллаура, может враз исчезнуть, и всё вернется на круги своя. Населению осталось вспомнить, как покупать валюту только по предъявлении паспорта и в ограниченных количествах. А там и до валютчиков недалеко.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

Лідзія САВІК, даследчыца сталінскіх рэпрэсій:

«Раскалолі народ сфальсіфікаванымі выбарамі і працягваюць расколваць рэпрэсіямі»

На пачатку 1990-х гадоў нешматлікая група беларускіх літаратуразнаўцаў і гісторыкаў атрымала доступ у архіў Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Тады ў СМІ ўпершыню трапілі факты, якія засведчылі маштабы сталінскага тэрору ў Беларусі, былі названы імёны многіх расстраляных у Курапатах і загінулых у ГУЛагу. Сярод тых, каму выпала вынесці на белы свет схаваную раней за сямю замкамі праўду, была даследчыца Лідзія САВІК. Я пацікавіўся ў яе, ці шмат агульнага паміж сталінскімі рэпрэсіямі і рэпрэсіямі сённяшнімі.

– Лідзія Сымонаўна, часы ўсё ж непараўнальна змяніліся. Ці правамерна сёння праводзіць паралелі паміж сталінскім тэрорам і тым, што сёння адбываецца ў Беларусі?

– Гэтыя паралелі для мяне відавочныя. Мы нібы зноў вярнуліся ў тыя страшныя 1930-я гады. Напрыклад, тады ўладай заахвочваліся даносы. А гляджу нядаўна – па Беларускім тэлебачанні абвяшчаюць: "Просим всех информировать власти о вывешенной незарегистрированной символике». Як можна заклікаць грамадзян да палітычных даносаў? Якія могуць быць даносы суседа на суседа?! Я што, за акадэмікам Радзімам Гарэцкім (мы з ім жывём у адным доме) павінна сачыць? Каля нашага дома часта можна было бачыць бел-чырвона-белыя стужачкі, купалаўскі заклік «Жыве Беларусь!». Назаўтра ўсё гэта вынішчалася, а людзі зноў усё аднаўлялі.

– Згаданы вамі Радзім Гарэцкі ў інтэрв'ю «Народнай Волі» цешыўся, што дажыў да часу, калі беларускі народ нарэшце прачнуўся. Але, як выглядае, існуючая ўлада зноў хоча вярнуць яго ў стан «спячкі». Ці гэта магчыма?

– Думаю, што немагчыма. Лукашэнкаўскі рэжым, наадварот, робіцца непрымальным нават для тых, хто ніколі не цікавіўся палітыкай. Сфальсіфікаваныя выбары 9 жніўня паказалі, што цярпець далей проста немагчыма. Слухайце, у нас жа перасталі дзейнічаць законы (згадайма вядомае выказванне «часам не да законаў). Невядома хто ў любы час можа схапіць выпадковага чалавека на вуліцы, завезці кудысьці, дзе яго будуць збіваць, здзекавацца з чалавечай годнасці. Пра гэта ж апублікавана безліч сведчанняў. Маладых, прыгожых людзей кідаюць у жудасныя камеры, якія нагадваюць катавальні. Мне ўжо сіл не хапае такое чытаць...

– Калісьці Станіслаў Ежы Лец казаў, што ў кожнага стагоддзя бывае сваё сярэднявечча (калі іншадумцаў на вогнішчах палілі). Беларускае сярэднявечча XXI стагоддзя прыйшлося на 2021 год?

– Можна і так сказаць. Як сярэднявечча XX стагоддзя прыйшлося на 1930-я гады. У мяне такое адчуванне, што мы зноў вярнуліся ў 1937-мы, прычым у больш жорсткім варыянце. Калі нас, даследчыкаў літаратуры, дапусцілі ў архіў КДБ, калі мы пагарталі тыя жудасныя папкі, на якіх было напісана «Совершенно секретно» і «Хранить вечно», то ніяк не маглі даўмецца: як *такое* ўвогуле магло адбыцца?! Помню, начытаешся пратаколаў, выйдзеш на вуліцу – і здаецца, што выйшаў з нейкай апраметнай. Столькі таленавітых людзей былі без усякай віны проста растаптаны… На кожным допыце яны задавалі следчым адно пытанне: «За што?» А хіба сёння мы яго не чуем?

– Гэта пытанне гучыць ледзь не пры кожным затрыманні, а яны па ўсёй краіне адбываюцца штодня.

– У гады сталіншчыны стваралася ілюзія хоць нейкай законнасці, змяняліся кіраўнікі ОГПУ-НКВД за тое, што парушалі закон. Іх нават судзілі і саміх расстрэльвалі. А ў нас што творыцца? Адзін чалавек – Лукашэнка – дыктуе правілы, паводле якіх мы ўсе павінны жыць. Ён лічыць, што разумнейшы за ўсіх. Ён усталяваў сапраўдны дыктатарскі рэжым з татальным кантролем над кожным з нас. Пачынаючы ад працоўных кантрактаў, якія трымаюць людзей на кароткім павадку. За апошнія паўгода на палітычных іншадумцаў заведзена больш за 3000 крымінальных спраў – паведаміў Следчы камітэт. І – ніводнай справы на тых, хто ў масках і з дубінкамі збіваюць, катуюць, забіваюць мірных людзей. Як такое можа быць?!

– Яшчэ адна паралель са сталінскімі часамі была праведзена нядаўна. Як вядома, на Сталіна пастаянна «арганізоўваліся замахі», і вось выкрыты «замах» на Лукашэнку. Наш з вамі калега, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў Аляксандр Фядута трапіў у СІЗА КДБ, яму пагражае да 12 гадоў турмы.

– Усе дыктатары свету арганізоўваюць такія «замахі» на сябе. Каб іх, бедных, народ пашкадаваў. І ў 1930-я гады ў чым толькі не абвінавачвалі пісьменнікаў! І ў тэроры, і ў дыверсіях, і ў замахах на правадыроў. Чалавек – ні сном ні духам, а яго абвінавачваюць тэрарыстам! Адзін хацеў далучыць Беларусь да Англіі, другі «прызнаваўся» ў шпіянажы на карысць Японіі, трэці аддаваў Беларусь пад пратэктарат Польшчы. Дык жа і сёння нам па БТ гавораць, што Польшча ўжо ледзь не заняла Гродзенскую вобласць... Што мяне яшчэ ўразіла – на допытах у НКВД некаторыя пісьменнікі, разумеючы ўсю недарэчнасць прыпісваных іх абвінавачванняў, гаварылі: не, мы хацелі аддаць Беларусь не пад Польшчу, а пад Індыю… Такім чынам пачынаілі кпіць са следчых.

– У тых умовах на гэта была патрэбна дадатковая мужнасць.

– Безумоўна! Помню, тагачасны старшыня КДБ Эдуард Шыркоўскі (мне падалося – ён быў шчырым беларусам) сабраў нас, даследчыкаў, у сваім кабінеце і сказаў: «Вы будзеце чытаць страшныя рэчы. Там столькі хлусні несусветнай! Рыхтуючы свае публікацыі, вы павінны разумець, што пісьменнікі не даносілі адзін на аднаго. З іх тыя паказанні выбівалі жудаснымі катаваннямі». Вось у чым сутнасць любой дыктатарскай улады – запляміць, абылгаць як мага большую колькасць людзей. Тое самае і сёння. Рэжым ілжэ на кожным кроку, выдумвае абы-што, пры гэтым цынічна абвяшчае ў краіне Год народнага адзінства! Дык вы ж гэты народ і раскалолі сваімі сфальсіфікаванымі выбарамі і працягваеце расколваць рэпрэсіямі.



– «Мы их будем мочить», – публічна заявіў Лукашэнка на адрас сваіх апанентаў. «Мачыць» на турэмным сленгу – забіваць. Рэпрэсіі ў Беларусі могуць перайсці ў масавы тэрор?

– Тэрор ужо пачаўся – ёсць забітыя. І, зноў жа, ніхто не панёс пакарання. Калі дыктатар застанецца пры ўладзе і будзе працягваць бегаць з аўтаматам і заяўляць, што ён ні за што сваю ўладу не аддасць, то можа дайсці і да новых Курапатаў. Толькі мы не адразу даведаемся, дзе тыя Курапаты. Як і дагэтуль не ведаем, дзе закапаны Захаранка, Ганчар, Красоўскі, Завадскі і іншыя.

– Мы жахаемся ад слоў «сталінскі тэрор», «ГУЛаг». А Лукашэнка, як выглядае, не жахаецца. Вось я сёння ў дзяржаўнай кнігарні пабачыў такія кнігі: «Сталин – символ Беларуси», «Минск – город Сталина», «Урок отца народов Сталина и батьки Лукашенко». Можа, Іосіф Вісарыёнавіч для Аляксандра Рыгоравіча – узор паспяховага палітыка?

– Хутчэй за ўсё, так і ёсць. Прынамсі, за 26 гадоў кіравання я не пачула ад яго асуджэння Сталіна, і ў Курапатах ён ні разу не быў. Што ж, ёсць з каго браць прыклад – «крамлёўскі горац» утрымліваў уладу 30 гадоў. Для мяне ж ён – увасабленне абсалютнага зла, ён столькі нявінных жыццяў загубіў! У сталінскія часы 15 хвілін ішлі суды над беларускімі пісьменнікамі. За 15 хвілін чалавека адпраўлялі на расстрэл! А сёння, я чытаю ў навінах, суды яшчэ карацейшыя. Праўда, прысуды пакуль – не вышэйшая мера... А па БТ бясконца паўтараюць: «Ці былі вы на "Лініі Сталіна"?» Не дзіва, што будуць выходзіць названыя вамі кнігі, якія пішуць падхалімамі-прыкарытнікамі. «Отец народов Сталин и батька Лукашенко»… Такія пісакі проста ўгадваюць жаданні дыктатара, сёння іх час.

– Ідучы да вас на гутарку, я пабачыў у двары трох у чорнай уніформе, што няспешна прагульваліся туды-сюды. Ваш двор пад нейкім звышпільным наглядам?

– Асабліва падчас нейкіх акцый. Вось я іду ў краму 25 сакавіка – наш двор поўны нейкіх камунальнікаў. Адзін ідзе насустрач, пытаюся: што здарылася, чаму вас так многа? А ён кажа: мы не камунальнікі... І штодзень па трое, па пяцёра ў чорным адзенні па двары ходзяць. А раптам хто-небудзь намалюе надпіс «Жыве Беларусь!»!.. А раптам збярэцца без дазволу 5–6 чалавек!.. Схопяць, адлубасяць, завязуць на Акрэсціна... Як мы ўсе стаміліся ад гэтых хапуноў, ад гэтага адзінаўладдзя!

– Пасля таго, як вы на пачатку 1990-х папрацавалі ў прыадкрытым архіве КДБ, ён пры Лукашэнку зноў закрыўся для даследчыкаў. Скажам, мне так і не ўдалося атрымаць доступ да справы Ларысы Геніюш… Помніцца, Станіслаў Шушкевіч гаварыў, што ён быў супраць адкрыцця, бо гэта пасеяла б варажнечу ў грамадстве. А вы як лічыце?

